

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

№39 (172). 21 — 27 верасня 2000г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 95 руб.

КАРТОШКА: ВЧЕРА И СЕГОДНЯ



Индейцы называли этот плод – потата, англичане переделали на свой лад – потэйто, французы до сих пор называют его "земляными яблоками".

ПРОДОЛЖЕНИЕ НА 3 СТР.

ОН ПРЕЗИДЕНТОМ СТАЛ СЛУЧАЙНО



ЧИТАЙТЕ НА 4 СТР.

Необходимость и последствия девальвации РУБЛЯ

Сегодня выход один – необходимо ослабить налоговый пресс.

ПРОДОЛЖЕНИЕ НА 6 СТР.

НАВІНЫ

Выбарчы старт дадзены

У панядзелак, 18 верасня, у слонімскім доме саветаў шэсць чалавек атрымалі пасведчанні кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

Але, як адзначыў старшыня выбарчай камісіі Слонімскай выбарчай акругі №60 Аляксандр Ганчар, цяпер ідзе праверка дэкларацый аб даходах і маёмасці кандыдатаў. І калі камісія выявіць нейкія сур'езныя несыходжанні з дадзенымі ў дакументах, то прэтындэнт на дэпутацкі мандат можа быць зняты з выбарчага марафону.

Разам з тым адзначым, што памагацца за права прадстаўляць наш рэгіён у рэспубліканскай Палаце прадстаўнікоў вырашылі наступныя асобы: 38-гадовы Віктар Герасімчык, майстар "Слоніммэбля", камуніст, член ПКБ; 48-гадовы Станіслаў Здановіч, старшыня Слонімскага райвыканкама, беспартыйны; 46-гадовы Аляксандр Кірычэнка, майстар ДЭУ-54, камуніст, член КПБ; 23-гадовы Сяргей Мудроў, эканаміст, беспартыйны; 48-гадовы Валеры Рэут, загадчык аддзела кадраў сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, беспартыйны; 48-гадовы Уладзімір Чухно, кіраўнік будаўнічага кааператыва "Імпульс" горада Ліды, беспартыйны.

Наш кар.

НАМ ПІШУЦЬ

Вялікі дзякуй!

Я выпісваю "Газету Слонімскую" з пачатку яе заснавання. І адразу скажу: газета мне дапамагае разабрацца ў многіх падзеях, якія адбываюцца ў нашым цяперашнім жыцці. Усе старонкі яе вельмі цікавыя, шмат канструктыўнай крытыкі, часта паднімаюцца праблемы, якія патрэбна вырашаць. Магчыма, не ўсім падабаецца тая крытыка, але яна дапамагае зразумець шматлікія праблемы сённяшняга дня. Дзякуй газеце і за тое, што яна надрукавала маю заметку аб тым, як у Слоніме крыўдзілі пенсіянераў. Пасля выхаду нумара ў свет, пенсіянерам Слоніма за праезд у аўтобусах па пятніцах, суботах, нядзелях зноў зрабілі льготны праезд.

Я выпісаў газету на чацвёрты квартал, хоць кошт на падпіску падрос. Выпішу і ў наступным годзе. Раю гэта зрабіць усім астатнім грамадзянам.

Васіль ПАЛЯШЧУК, пенсіянер

СЛОНІМЦЫ на будоўлях Расіі



Сёння цяжка жыць на Беларусі, цяжка знайсці добры заробак, каб забяспечваць сям'ю. Таму і едуць нашы земляки ў Расію, Польшчу, Нямеччыну. Як ім там працуецца? Пра гэта згадзіўся расказаць слонімец Іван, які з іншымі слонімцамі працуе на будоўлях у Расіі.

У Маскве працавалі па 12 гадзін

Я пачаў ездзіць у Расію на заробкі гадоў шэсць назад. Выпадкова ўбачыў у горадзе аб'яву, што набіраюцца людзі на працу ў Маскву. Першы раз паехаў паглядзець і зразумеў, што там можна добра зарабіць (ад 200 і болей даляраў). Камусьці падасца, што дробязь, але такіх грошай тут я б не зарабіў.

Пацяху ўцягнуўся. Брыгада ў нас цалкам была слонімская. Спачатку паехалі 36 чалавек, а ўвогуле там пабывала больш за 100 чалавек. Узрост самы розны – ад 20-ці гадоў і да пенсіянераў. Хто спецыяліст, а хто не...

У Маскве вахта працягвалася 2 месяцы, і 15 дзён былі дома. Працавалі па 12 гадзін у дзень. Спачатку 250-270 зробленых даляраў здаваліся нармальнай сумай. Але дома грошы трацяцца вельмі хутка, а я яшчэ і будую дом. Калі зноў едзеш на працу, то даводзілася пазычаць грошы на квіток...

Я спецыялізуюся на рамонце і аздабленні кватэр. Рабілі рамонт у кватэры Барыса Маісеева. На чацвёртым паверсе ён жыве. Кватэра ў яго аднапакаёвая, але якая! Там ванны пакой, як у мяне ўвесь дом... У такія кватэры ўкладваюцца вар'яцкія грошы. Адзін квадратны метр жылплошчы каштуе 2960 даляраў!

Калі ў Маскве працаваў на кватэрах, у месяц удавалася зарабіць і 500, і 700 даляраў. А здаралася, што і зусім нічога не плацілі. Праўда, са мной такое было толькі адзін раз. Самае цікавае, што ашукаў міліцыянер. Мы яму адрамантавалі адзін пакой у кватэры, і добра, што сказалі, каб ён за яго разлічыўся, а тады абяцалі зрабіць астатнія. А міліцыянер абяцаў, абяцаў і не разлічыўся... Калі мы зноў прыйшлі да яго, у кватэры ўжо працавалі іншыя людзі.

(Працяг на 2 стр.)

СЛАВЯНСКИЙ "СОЮЗ ДВУХ": "Красная Шапочка и Серый Волк"

Непомерно высокой для Беларуси оказалась цена "братских" объятий с Россией в XX веке в составе Союза ССР (еще большую придется заплатить ей в XXI веке в "Союзе двух").

Интеграция по-российски

По переписи, проводимой генштабом царской России в 1897 г. более 70% населения Смоленщины составляли белорусы-кривичи, о чем свидетельствовали язык, этнические и культурные особенности. В Союзе ССР, в интегрированной с Россией Смоленщине, осуществлена почти 100%-ая ассимиляция населения края путем ликвидации здесь белорусского языка и разрушения исторической памяти. Разрушение исторических и культурных традиций происходило одновременно с массовым переселением кривичей-смолян на просторы советской империи (еще в большей степени, чем в Беларуси, население здесь к концу XX века уменьшилось по сравнению с началом столетия).

Есть все основания считать, что судьба белорусской Смоленщины – это прообраз будущего Беларуси в рамках нового "тесного" союза. Русифицирована и заросла хмызняком в XX веке Смоленщина в большей степени, чем Беларусь, лишь потому, что была крепче привязана к России, чем БССР.

(Продолжение на 5 стр.)



Слонімцы на будоўлях Расіі

(Працяг. Пачатак на 1 стр.)

З міліцыянерам трэба "дзяліцца"

Звычайна мы жывем там, дзе працуем. Часцей за ўсё ў інтэрнатах. У Маскве працавалі легальна, у адрозненні ад іншых. З дакументамі было ўсё нармальна. Пра гэта паклапацілася наша фірма. А без прапіскі там шмат людзей працуе. Калі міліцыя такіх затрымае, то грошы, якія ляжаць у кішэні чалавека, адразу перакачуюць да міліцыянера, які кажа, што "трэба дзяліцца"... Але "дзялёжка" у іх цікавая — яны ўсе грошы забіраюць сабе. Калі едзеш у Беларусь, то заробак звычайна хаваеш, а ў кішэнь кладзеш толькі 200-300 рублёў. Пры даглядзе міліцыянеры іх забіраюць. У Маскве шманаюць на кожным кроку і паўсюль. Вылічваюць нас па вялікіх сумках. Пакуль да Беларускага вакзала дабярэшся, то абавязкова дватры разы цябе спыняць. А на вакзале — абавязкова.

Неяк я з маладым міліцыянерам у метро размаўляў. Пытаюся: "Слухай, ну як ты вызначаеш не мясцовых?". Той гаворыць: "А дзе ты бачыў масквіча, каб ён штаны запраўляў у боты?!". І сапраўды, менавіта так і былі апрануты некаторыя слонімскія хлопцы...

Шэраг расійскіх фірм сваіх рабочых кормяць, аплочваюць ім праезд у метро. Але звычайна, калі ў Маскву едзем, бярэм з сабой "непад'ёмную" сумку з салам, цыбуляй... Аднойчы слонімцы заказалі аўтобус, загрузілі яго бульбай і на ім паехалі ў Маскву.

Дзесяць даляраў за рызыку

Будавалі мы і храм Хрыста Збаўцы. Спяшылі, каб паспець да юбілею Масквы. Нашы будаўнікі казалі, што крыўдна было, калі Лужкоў з Ельцыным на адкрыцці храма дзякавалі "маскоўскім будаўнікам за тое, што пабудавалі храм". На самай справе будавалі яго беларусы і ўкраінцы, а маскоўскіх будаўнікоў была толькі адна брыгада (15 чалавек)...

На будаўніцтве храма загінула шмат людзей. На маіх вачах толькі за два дні загінулі два чалавекі. Я сам ледзь не сарваўся з рыштаванняў. Наступіў на край дошкі і паляцеў... Сябар схапіў мяне за капюшон курткі і выратаваў... Тыя рыштаванні рабілі ўкраінцы, начальства іх падганяла, усё рабілася ў спешцы. За рызыку нам абяцалі заплаціць прэмію па 100 даляраў. А заплацілі па 10.

Цікава, што за адну і тую ж работу масквіч атрымоўваў 350 даляраў, працуючы з 8 да 17.00. Нам плацілі па 250 даляраў за працоўны дзень з 8 да 20.00... І паўсюдна так. Украінцы атрымоўваюць яшчэ менш — ад 100 да 150 даляраў. А цяпер Маскву запаланілі таджыкі і іншыя бежанцы з Азіі. Яны працуюць за 5 даляраў у дзень. Наогул, яны згодныя працаваць за харчаванне і начлег.

Калі ў жніўні 1999 г. быў абвал рускага рубля, мы згубілі шмат грошай, бо разлічваліся з намі расійскімі рублямі. Некаторыя, хто клаў грошы на валютныя ўклады, да гэтага часу іх не атрымалі...

З грашыма вяртаюцца не ўсе

Апошні раз я працаваў у Якуціі (цяпер "Рэспубліка Саха"). Нашых, што вяртаюцца адтуль у Беларусь, бандыты ловяць у маскоўскім аэрапорце. Вось з групы з чатырох чалавек, што нядаўна вярнуліся, толькі адзін прыехаў з грашыма. І то, дзякуючы таму, што ў аэрапорце паспеў злавіць міліцыянера. Рэкецяры ў яго хацелі ўжо забраць грошы, а ён кінуўся да міліцыянера. Той ад яго ўцякаў. Міліцыя ж куплена. Таму яму проста пашчасціла ў гэты раз, што яго пакінулі ў спакоі. А так двое слонімскіх прыехала зусім без грошай, а адзін бабруйскі хлопец да гэтага часу яшчэ не з'явіўся...

У горадзе Мірным ёсць дзве фірмы, дзе працуюць адны беларусы. Мы і іншая фірма, якая будуе праваслаўны храм.

У нас брыгада — 60 чалавек. Аб'ектаў было штук дзесяць. А там вясна, лета і восень укладваюцца ў тры месяцы, а астатнія 9 — зіма. І за гэты час трэба ўсё паспець зрабіць. Будавалі мы і для фірмы, якая здабывае алмазы. У Мірным здабываюцца алмазы з глыбіні 800 метраў, па 6 кілаграмаў у месяц.

Інтэрнат у Мірным

Сто чалавек працуе ў нашай фірме, з іх 90 са Слоніма. Цяпер у Якуціі ўмовы працы цяжкія, бо тэмпература ўжо мінус 15. Хлопцы адляталі, казалі, што снег ішоў. А некаторыя паехалі на працу яшчэ ў летнім адзенні, цяпер у іх кантракты скончыліся, а выехаць адтуль не могуць. Сядзяць там у інтэрнаце.

Інтэрнатам у Мірным называюць будынак, дзе раней выраблялiся скуры аленяў. Днямі яны званілі, казалі, што ацяпленне там дагэтуль не працуе, спяць у целагрэйках, у два ярусы. Пол з дзіркамі...

Некаторым даводзіцца зімой працаваць на марозе ў 53 градусы. Дзесяць мінут працуюць, а пасля ў вагончык бягуць, каб адагрэцца. І так зноў, і зноў...

Зарплата за паўгадзіны перад вылетам

Дагаворы з намі заключаюць, але ўмовы не выконваюцца. Тарыфная стаўка — 34 рублі ў гадзіну (гэта з паўночнымі), а атрымоўваецца 26 рублёў. У дамове не напісана ні пра працэнты, ні пра харчаванне. Усё вылічваецца ўжо пасля. Працаваць даводзіцца па 13-14 гадзін. Выхадных няма, толькі ў нядзелю працавалі да 2 гадзін дня, бо пасля палудня ішлі ў лазню. У Маскве ж працавалі ў суботу да абеду, а нядзеля была выхадным днём.

Сістэма працы такая: 2 гадзіны працуеш, 10 мінут — перакур. Там ёсць спецыяльны чалавек, які за працай сочыць. Калі ты доўга сядзіш, то цябе пазбавяць прэміі. Цікава, што тарыфная стаўка складаецца: 50% асноўная зарплата, а 50% — прэміяльныя. І калі цябе пазбавяць прэміі, то нічога не заробіш...

Звычайна, зарплату плацілі ў дзень ад'езду. За гадзіну ці паўгадзіны. Маглі не заплаціць усіх грошай, і ты нічога не зробіш, бо трэба спяшацца на самалёт.

Бліжэйшы горад ад Мірнага — за 1000 кіламетраў. Там чалавек можа знікнуць, і яго ніхто не будзе шукаць. А дзе яго шукаць? Навокал лесатундра...

Пра якуцкіх "снайпераў" і "Слонім Лайн"

У Мірным якутаў мала. Там больш вахтавікі жывуць. А вось у наваколлі шмат якутаў. Аднойчы на нейкае якуцкае свята мы будавалі мост каля іх пасёлка. Павыходзілі якуты і пачалі па нас страляць з "вінчэсцераў"...

Мірны вельмі дарагі горад. Цэны ў 2-3 разы вышэйшыя, чым у Маскве. Лячэнне там платнае, нават за першую медыцынскую дапамогу трэба плаціць. А мы ўсе, пакуль акліматызаваліся, перахварэлі.

Увесь горад завалены пустымі бутэлькамі з-пад гарэлкі. Яе ў Мірны завозяць на самалёце, але бутэлькі нідзе не прымаюць і не вывозяць.

Гуляюць па горадзе розныя венерычныя хваробы, СНІД. Цябе не возьмуць на працу, пакуль не прынясеш даведку, што ты не хворы на СНІД.

Наша фірма называецца "Сноў Лайн", але мы яе называем "Слонім Лайн". Наогул, слонімцы зрабілі шмат, каб у Мірным ведалі Слонім.

Беларусы лічацца ў Расіі людзьмі другога гатунку. Калі мы працавалі ў Маскве на Цвярской, з намі рабілі югаславы. Яны атрымоўвалі 5000 даляраў у месяц. Югаславы наймалі палякаў, якія працавалі за дзве тысячы. А палякі нанялі ўкраінцаў за сто даляраў. Такі вось інтэрнацыянальны ланцужок.

Кожны раз, калі вяртаюся, вырашаю, што больш у той кашмар не паеду. Але, калі заканчваюцца грошы, зноў збіраюся ў Расію. Там за адну вахту (хоць нас там абманваюць і плацяць менш, чым павінны) зараблю столькі, колькі тут за год-два. А каб тут нармальна плацілі, то я нікуды б не ездзіў.

Запісаў Сяргей ЁРШ

НАВІНЫ

"Грымата" паедзе на "Дажынкі"

Фальклорны ансамбль "Грымата" (кіраўнік Валянціна Пятрашка) Слонімскага РДК прыме ўдзел у "Дажынках-2000", якія пройдуць на радзіме Аляксандра Лукашэнкі ў горадзе Шклове Магілёўскай вобласці.

Нашы артысты з песнямі выступяць на цэнтральнай сцэне і ў адной з гаспадарак гэтага раёна.

Цёплая печка будзе каштаваць грошай

Як паведамілі карэспандэнту "ГС" у Слонімскім гарпаліўзбыце, сёння вугаль прадаецца прыблізна каля 50 тысяч рублёў за адну тону.

А вось тона брыкету каштуе 5130 рублёў, а тона дроў — 710 рублёў.

Падаражэла святло

З 11 верасня ў Беларусі падаражэла электраэнергія.

Як сказала карэспандэнту "ГС" намеснік начальніка раёна электрасетак Ганна Армяноўская, за 1кВт/г гарадское насельніцтва будзе плаціць 14,4 рубля, а вясковыя — 10,4 рубля.

"Маўглі" на Случчыне

Слонімскі беларускі драматычны тэатр гастралюе па Беларусі: Слуцк, Салігорск, Капыль.

Нашы артысты знаёмяць юных гледачоў з прэм'ерай новага спектакля "Маўглі", пастаўленага па п'есе Аляксея Якімовіча.

Слонімскія більярдысты — другія ў рэспубліцы

Слонімскія більярдысты пад кіраўніцтвам Леаніда Рэчыца нядаўна вярнуліся з Віцебска, дзе праходзілі спаборніцтвы па більярду на Кубак Рэспублікі Беларусь.

Наша каманда выступіла ўдала і заняла другое месца.

Сяргей ЧЫГРЫН

Сумная статыстыка Мастоўшчыны

Згодна дадзеных Мастоўскага раённага аддзела статыстыкі ў рэгіёне за першае паўгоддзе нарадзілася 187 чалавек, а памерла — 389.

Натуральны спад насельніцтва складае 202 чалавекі.

За гэты час быў зарэгістраваны 91 шлюб.

Язэп ПАЛУБЯТКА

На Гродненщине — 102 ВИЧ-инфицированных

На сегодняшний день в Гродненской области зарегистрировано 102 ВИЧ-инфицированных больных.

Среди них — 82 в Лиде и Лидском районе, 14 — в Гродно, 2 — в Волковыске, по одному в Слониме, Мостах, Новогрудке и в Вороновском районе.

Михаил ОКУЛКО

ЗДАРЭННІ

Заснула за рулём

У панядзелак, 18 верасня, адбылася аварыя на шасэ Ваўкавыск — Слонім.

Недалёка ад Чамяроў іншамарка з жыхарамі Мінска згубіла кіраванне і перавярнулася. Высветлілася, што прычынай аварыі стала тое, што жанчына-вадзіцель заснула за рулём. Некалькі чалавек атрымалі цялесныя пашкоджанні.

Іншамаркай — у аўтобус

18 верасня ў Слоніме каля райаграпрамтэхнікі іншамарка сутыкнулася з гарадскім маршрутным аўтобусам №7.

Вось што пра гэта расказаў начальнік аддзялення ДАІ Віктар Андрэеўскі. Пад час руху "фольксфаген" стаў абганяць аўтобус, які належыць саўгасу "Пераможац". За ім ехала маршрутная "сямёрка", якая стала паварочваць на свой канечны прыпынак. Іншамарка абагнала саўгасны аўтобус і на вялікай хуткасці стукнула ў самы цэнтр "сямёркі". У выніку аварыі некалькі чалавек атрымалі цялесныя пашкоджанні, а з бензабака аўтобуса выцекла больш 130 літраў бензіну.

Высветлілася, што вадзіцель іншамаркі, жыхар г. Слоніма П., быў у стане алкагольнага ап'янення. Па некаторых звестках, у салоне яго аўтамабіля былі знойдзены канапля і газавы пісталет. Вядзецца расследаванне.

Алег ТАЧОНЫ

Пажар у Скоўдзічах

У аднаго з жыхароў вёскі Скоўдзічы Слонімскага раёна загарэлася летняя кухня.

Агнём пашкоджаны дах, сцены. Прычынай пажару стала няспраўная дымавая труба.

Сяргей ЧЫГРЫН

В Дятлово "минировали" банк

Телефонный хулиган сообщил, что в кассу АСБ "Беларусбанка", что на Комсомольской улице в Дятлово, заложена бомба.

Группа разминирования, прибывшая на место и обследовавшая помещения, взрывного устройства не обнаружила.

"МВ"

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
..........(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

Падпісана да друку 20 верасня 2000г. Час падпісання 7:00.
Надрукавана ў Слонімскай узбуйненай друкарні, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
Наклад 9300 экз.
Заказ № 2918

КАРТОШКА: ВЧЕРА И СЕГОДНЯ

Индейцы называли этот плод – потата, англичане переделали на свой лад – потэйто, французы до сих пор называют его "земляными яблоками". Итальянцы назвали его "земляным грибом" – тартуфоло; немцы название его переделали по-своему: картофель. Последнее название и закрепилось у нас.

Хотя картофель используется индейцами Южной Америки уже более 14 тысяч лет, признание во всём мире он получил сравнительно недавно. В Европу (Испанию) картофель впервые завезён в середине XVIв. В 1616г. картофель (он ещё не стал картошкой) как редкость подавали во Франции к королевскому столу. Выращивали его в ботанических садах, на специальных плантациях. Но народ, не доверяя новому продукту, предпочитал по-прежнему зерно и корнеплоды. Прусский король Фридрих 11 посылал драчунов наблюдать за тем, чтобы крестьяне обязательно сажали картофель.

Тартуфель – первое название картошки у нас – подавали на придворных банкетах уже в 1741г. Но сколько? На банкет 23 июля 1741г. отпущено тартуфлю ... полфунта, то есть примерно двести граммов.

Вплоть до середины XIX века картофель приходилось не столько сажать, сколько насаждать, вводить силой, преодолевая недоверие, предрассудки и даже открытое сопротивление...

Канули в Лету те далёкие времена. Теперь люди картошку любят и уважают, и сажают её повсеместно. Правда, убрать её с поля было несколько проблематично.

На помощь приходили и приходят школьники, студенты, интеллигентская прослойка и сознательный рабочий класс. И всё это в добровольно-принудительном порядке.

Сейчас от желающих поучаствовать в уборке второго хлеба отбоя нет. И не удивительно. Безработных у нас хватает.



Фота Віталя Гоя

Сбор на площади Ленина в 8.00

Вот подумал и я на эту самую картошку съездить. И знакомые нашлись, что не первый год осенью по колхозам мотаются. На этот раз собрались ехать в колхоз им. Дзержинского – там, говорят, и заработать можно хорошо, и картошки с собой разрешают взять.

Сбор в восемь на Шоссейной улице у магазина. Приходим заранее, но мы уже не первые и не последние. Поработать на поле собралось человек 50. Народ разношерстный. Мимо нашей толпы люди проходят, на работу спешат, на нас этак свысока презрительно поглядывают: что, мол, за гоп-компания? А мы, знай себе, свои разговоры ведём. А вот и машина за нами подъехала – бортовой "газон" с будкой, мест на 30 посадочных. Главная задача – забраться в машину самому и помочь проделать то же самое другу. Впрочем, спешить, как оказалось, было некуда – сели все. Вернее, как селёдка в бочке, набились, но в обиде никто не был.

С грехом пополам, с шутками-прибаутками доехали, а на поле уже человек 40 работы ждут, да ещё после нас столько же подвезли.

Привезти-то нас привезли, а вот транспортом, куда картошку собирать, не обеспечили. И прохлаждались мы, разбившись на бригады по 10 человек, часов до 10. Вот начали и машины подъезжать. С завидным постоянством, с интервалом минут в 20 одна за другой. А народ-то нервничает, в работу так и рвётся.

Бригады на перехват машин свои дозоры стали высылать. Технику чуть ли не с боем захватывали, а всё одно на все бригады не хватило. Поэтому разбросали нас, горемычных, кого куда. Известное дело, в хорошем, дружном коллективе работается в охоту и дело спорится. Трактор (5 тонн) набираем за полтора часа, не напрягаясь...

Пока ждёшь его возвращения с весовой – почти час проходит. Так что проработала наша бригада три часа чистого времени: два трактора набрали, по 1600 рублей заработали и по ведру картошки с собой прихватили. Для первого дня как бы неплохо.

В последующие дни всё более-менее наладилось: машин хватает, а вот копалки не всегда поспевают новые борозды прокапывать.

Люди в бригадах были разные. Где толковые – там работа ладилась. А где после копки с вечера пьют, утром похмеляются, да ещё и на поле с собой прихватят – там не до работы. Люди, в общем-то, самые разные ездят: и безработные со стажем, и пенсионеры, и отпускники (многие специально отпуск на осень берут). А почему бы и не ездить – и заработаешь, и на зиму картошки мешка 2-3 по ведёрку в день за сезон привезёшь. Ну, а кто всё заработанное в вино-водочном отделе гастронома оставляет – это уж его личное дело. Только ведь и заводскую зарплату можно туда же приносить.

Ну, да что нам о грустном говорить! Главное, картошка нынче неплохая уродилась. Жить, значит, будем. Да и что белорусский стол без картошки. Недаром же нас, белорусов, "бульбашами" называют.

Валерий КОВАЛЕНКО

ГОРАД

СМЕЦЦЕ ВАКОЛ НАС


Сёння часта можна пачуць нараканні на радыяцыю ад Чарнобыля, на незбалансаванае харчаванне, на загазаванасць паветра і г.д. Сапраўды, існуюць у наш час глабальныя экалагічныя праблемы, якія мы, звычайныя людзі, вырашыць адразу не можам. Але ёсць праблемы, якія нам пад сілу.

Часта прыходзіцца назіраць, як у выхадныя дні слонімцы наводзяць парадак у сваіх кватэрах: выбіваюць дываны, выносяць смецце, мыюць вокны і балконы. Кожны хоча, каб на іх 30-ці ці 50-ці квадратных метрах была чысціня. Але чаму мы далей свайго носа не бачым? Не бачым, што за вокнамі нашых кватэр знаходзіцца расаднік смецця і бруду, а мы спяшаемся і не заўважаем. Ці не хочам заўважаць, каб не ствараць сабе праблемы?

Вядома, не ўсё так песімістычна. Ёсць сярод нас неабыякавыя людзі, якіх хвалюе чысціня нашага горада. Нядаўна ў рэдакцыю патэлефанаваў слонімец Аляксандр Вялічка і паведаміў, што на праспекце Незалежнасці, каля дома № 17 смецце з іх двара вывозіцца толькі раз у тыдзень. Улічваючы густанаселенасць мікрараёна, можна ўявіць сабе, якая антысанітарыя пануе навокал. А можа лепш каля кожнага дома выкапаць яму і скідваць смецце туды. Практыкуюць жа ў Слоніме і такое (на здымку: гэтая скрыня для смецця стаяла на мяжы гаражных кааператываў у мікраёне Энка).

Карэспандэнт "ГС" не звярталася па каментарый да экалагічнай службы горада і да тых, хто адказны за вываз смецця. Усё тут і так ясна. Хочацца проста папрасіць усіх слонімцаў, і хто пры пасадах, і радавых грамадзян: давайце любіць свой горад і жыць чыста. Бо чысціня, сапраўды, – залог нашага здароўя.

Сяргей ЧЫГРЫН





ЗДАРЭННІ

Краў у "Радзімы"

Саракагадовы жыхар Віктар Я. з вёскі Пруд Зэльвенскага раёна вырашыў тое-сёе прыбраць сабе, што належала калгасу "Радзіма".

Спачатку ён украў некалькі дзесяткаў кілаграмаў камбікорму, а нядаўна з трактара зліў 160 літраў саляркі. Супраць яго ўзбуджана крымінальная справа.

Злодзей-альпініст

Раней судзімы жыхар Зэльвы ў сваёй былой сужыцелькі ўкраў 39 бутэлек гарэлкі.

Дзейнічаў ён як сапраўдны альпініст. Залез на дах пяціпавярховага дома, а адтуль на вяроўцы спусціўся на балкон чацвёртага паверха, разбіў шкло і ўвайшоў у кватэру. Пасля ўзяў гарэлку і праз дзверы выйшаў на вуліцу.

Міліцыя затрымала злодзея.

Сяргей ЧЫГРЫН

Зніклі боты

З незвычайнай заявай звярнулася ў міліцыю мастаўчанка М.

Яна паведаміла, што з яе кватэры нехта ўкраў гумовыя боты.

Труп у кватэры

У кватэры дома № 9 па вуліцы К. Цэткін у Мастах быў знойдзены труп пяцідзесяцігадовага мужчыны.

Асобу чалавека міліцыя ўстанавіла, а прычыну смерці высвятляе следства.

Антон МАКЕЙ

Няўдзячны хворы

Днямі медыкі ў Мастоўскай бальніцы затрымалі і перадалі міліцыі хворага, які выносіў з палаты пасцельную бялізну.

Пяцідзесяцігадовы мужчына, які нідзе не працуе, вырашыў такім чынам займець грошы на выпіўку.

Чыгунка — небяспечная зона

Непадалёку ад Мастоў на чыгуначнай каляі былі знойдзены трупы мужчыны і каровы.

Ахвяраю наезду лакаматыва стаў 73-гадовы грамадзянін К., які да выхаду на пенсію ўсё жыццё працаваў на чыгунцы.

Кабеты высветлілі адносіны

У вёсцы Пладовая Мастоўскага раёна дзве жанчыны моцна пасварыліся.

У выніку гэтай спрэчкі адна з кабет кінулася на падворак сваёй суседкі і павыбівала ў хаце вокны.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Действовал табачный дуэт

В деревне Александровка Волковысского района два 16-летних местных жителя ограбили ЗИЛ, который стоял во дворе их земляка.

Они украли из кузова несколько коробов сигарет Гродненской табачной фабрики на сумму 355 тысяч рублей. К утру милиция воров задержала.

Нагадала цыганка

С 70 тысячами рублей, 5 наименованиями золотых изделий и личными вещами рассталась жительница Мостов после общения с цыганкой.

Цыганка исчезла в неизвестном направлении, а девушка осталась без денег и золота.

"МВ"

Газета Слонімская
21 — 27 верасня, 2000г. № 39 (172)

пошта: пісьмо каменцірце дырэктар

"Не трэба баяцца, што фабрыка спыніцца..."

У рэдакцыю "ГС" прыйшло пісьмо ад нашай чытачкі Алены Аўчыннікавай. Яна піша: "Здравствуй, любимая газета! На твоей странице я недавно прочитала объявление, что Слонимской фабрике художественных изделий требуются швеи с зарплатой 40 тысяч рублей. У меня подруга работает швеёй и получает 15-17 тысяч. Но вот пришёл новый директор, и зарплата утроилась... Я слышала, что у фабрики имеется задолженность по выплате денег за сделанную работу, и уже полгода фабрика не платит в бюджет ничего. Не получится ли так, что я приду работать на фабрику, а администрация вернётся к прежней низкой зарплате? Помоги мне газета и раскрой правду с помощью компетентных людей.".

Самым кампетэнтным чалавекам карэспандэнт "ГС" палічыў дырэктара Слонімскай фабрыкі мастацкіх вырабаў Паўла Карняйкова. Ён пагадзіўся пракаменціраваць пісьмо Алены Аўчыннікавай.

— Вяртання да ранейшай зарплаты, адназначна, ужо не будзе, — сказаў Павел Іванавіч. — Запазычанасць па бюджэту ёсць, яна мне, як дырэктару, засталася ў спадчыну. Мы стараемся яе пагасіць. А вось запазычанасці па зарплаце ўжо няма два месяцы. Фабрыка пачала працаваць у дзве змены. Пасля аб'явы ў вашай газеце, за два тыдні мы працаўладкавалі на фабрыку 30 швачак. Другая змена ўкамплектавана і працуе на 50%. Яшчэ засталося прыняць на працу 30-40 швачак, і дзве змены будуць працаваць на поўную сілу.

— Што датычыць заказаў, — сказаў дырэктар, — дык іх паступіла шмат. І не трэба баяцца, што наша прадпрыемства зноў спыніцца. Ёсць сыравіна, ёсць заказы. У першую чаргу з Германіі, паступілі прапановы і ад амерыканцаў. Сёння на фабрыцы працы хапіла б і на тры змены, але пакуль няма людзей. За жнівень сярэдняя зарплата швачак склала 41 тысячу рублёў, — сказаў дырэктар Слонімскай фабрыкі мастацкіх вырабаў Павел Карняйкоў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ОН ПРЕЗИДЕНТОМ СТАЛ СЛУЧАЙНО

"Думать и размышлять" призвал президент Беларуси Александр Лукашенко потенциальных избирателей депутатов в парламент страны — работников Белорусского металлургического завода — в ходе своего рабочего визита в Жлобин (Гомельская область) 15 сентября. "Упрекать нынешний парламент я не имею права", — сказал президент, объяснив это тем, что в Палату представителей вошли те депутаты, "которые не предали парламент в 1996 году". Другая часть депутатов, по словам Лукашенко, "кормится на Западе", "просит у них миллионы, чтобы драть нашу страну".

Далее в общении с народом Лукашенко перешел уже к теме президентских выборов. Он призвал голосовать за того человека, "который вас никогда не предаст".

В отношении оппозиции президент предостерег народ: "Они могут прийти к власти или путем обмана, или больших денег. А если они придут к власти, то рассчитаются с теми, кто их привел, вами, нашей страной и нашими заводами". В то же время Лукашенко заявил, что сам он стал президентом случайно.

Ирина ШАНЦЕВА



Фота IREX/ProMedia

Президент обещает добавить зарплаты

К осени 2001 года средняя заработная плата в Беларуси должна составлять 100 долларов США. Такую задачу поставил Александр Лукашенко перед правительством на совещании 13 сентября.

По словам главы государства, уровень зарплаты будет подниматься постепенно: на 20–25 процентов в последнем квартале этого года, в первом — начале второго квартала будущего года — еще на 25 процентов и к лету-осени — до 100 долларов США. "Значит, у нас будут люди, которые будут получать и 500 долларов, и 400, и 300, и 70, и 80 долларов США, но средняя зарплата должна быть 100", — подчеркнул Лукашенко. Сегодняшняя средняя зарплата — около 50 долларов — это "крайне недостаточно при нынешних ценах", отметил он. Однако резко увеличить уровень оплаты труда правительство не может: экономика, по словам президента, "этого не выдержит".

Лукашенко также заявил, что при росте зарплаты в течение года не должно быть практически никакого роста цен. Президент предупредил правительство, что в последний квартал этого года оно "не имеет права" поднимать цены больше чем на 3 процента, а в будущем году — не больше чем на 2,5–3 процента ежемесячно. Согласно прогнозам на будущий год, это вполне реально, подчеркнул Александр Лукашенко.

Наталья КУЛАГИНА

ЗНОЙДЗЕНЫ АСТАНКІ САВЕЦКІХ САЛДАТ

На Слонімшчыне працуе ўзвод пошукавай роты з Гродна.

Па словах слонімскага ваенкома Аляксандра Купкі, каля вёскі Лапухова былі знойдзены астанкі 22 савецкіх салдат, загінуўшых падчас вайны. Была знойдзена таксама стралковая зброя, пяць капсул, у якіх, магчыма, захавалася інфармацыя пра забітых.

Месцы ж для пошукаў падказваюць мясцовыя жыхары. Мяркуецца, што гродзенскія вайскоўцы будуць працаваць яшчэ і каля вёскі Хадзявічы.

Сяргей ЁРШ

Уродила бульбочка

По прогнозам специалистов Министерства сельского хозяйства и продовольствия Беларуси, нынешней осенью в республике будет очень хороший урожай картофеля.

Согласно последним оперативным данным, картофель убран на площади 8,7 тысячи гектаров, что составляет 10 процентов к посаженному. Средняя урожайность составляет 168,4 центнера с гектара. Если сравнивать с минувшим годом, то в середине сентября 1999 года урожайность составляла лишь 109 центнеров с гектара. В то же время на тот момент было убрано уже 19 тысяч гектаров или 23 процента к посаженному.

В Минсельхозпроде заявили, что никаких проблем с приобретением картофеля этой зимой у горожан не будет — напротив, уже сейчас возникают проблемы с его сбытом. И это несмотря на то, что цены на "второй хлеб" довольно низкие. Так, картофель, поступающий на промышленную переработку, реализуется по цене 65 тысяч рублей за тонну, продовольственный — 80 тысяч Никаких реальных крупных контрактов на поставку картофеля за пределы Беларуси пока не заключено.

БелаПАН

Строгать и пилить только по лицензии

Правительство Беларуси установило, что с 3 апреля 2001 года лесопильное и строгальное производство, которое осуществляется юридическими лицами и индивидуальными предпринимателями, будет производиться только при наличии лицензии.

Исключение составят лишь колхозы, совхозы и другие сельскохозяйственные организации, занимающиеся лесопильным и строгальным производством для собственных нужд.

Как сообщили БелаПАН в Министерстве лесного хозяйства Беларуси, на данный момент не подсчитано количество юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, занимающихся лесопильным и строгальным производством. Одна из целей введения лицензирования как раз и заключается в выявлении точного количества таких предприятий и физических лиц. Положение о порядке выдачи лицензий на лесопильное и строгальное производство будет разработано и утверждено Минлесхозом до декабря текущего года.

Алексей ОРЕШКО

Кандидаты в эфире

Окружные избирательные комиссии провели жеребьевку очередности выступлений кандидатов в депутаты Палаты представителей Национального собрания на телевидении и радио.

Согласно постановлению Центральной комиссии Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов о порядке использования государственных СМИ при подготовке и проведении выборов депутатов Палаты представителей, для выступлений в радио- и телеэфире кандидатам в депутаты будет предоставлено по пять минут.

С 20 сентября кандидатам в депутаты, баллотирующимся по регионам республики, местные власти должны предоставить возможность выступить по местному проводному радио и региональному телевидению.

БелаПАН

Готовиться указ

Должностные лица, руководители предприятий и учреждений, не обеспечившие своевременную выплату заработной платы, понесут наказание.

В ближайшее время на рассмотрение главы государства будет представлен проект соответствующего указа. Как сообщает пресс-служба президента Беларуси, об этом Александр Лукашенко заявил 13 сентября во время встречи с председателем Комитета государственного контроля (КГК) Анатолием Тозиком. Руководитель КГК доложил о результатах работы комиссии по проверке своевременности выплаты заработной платы, созданной по распоряжению президента 31 августа. Лукашенко заявил, что вопрос своевременной выплаты зарплаты должен находиться под постоянным контролем контролеров.

Помимо этого, отметил президент, приоритетным направлением деятельности КГК должен стать контроль над рациональным расходованием бюджетных средств. Речь идет, прежде всего, об обоснованности расходов на содержание аппарата органов госуправления, вопросах собственности, топливно-энергетического комплекса, энергозачетов, обращения подакцизных товаров, проблем импорта, особенно закупок товаров критического импорта, и проведения тендеров.

Наталья КУЛАГИНА

Беларусь посередине

Беларусь находится ровно посередине в списке из 90 стран, которые классифицировала по уровню коррупции международная организация Transparency International.

Индекс CPI, который составляет эта организация, подсчитывается в течение трех лет на основе опросов бизнесменов, аналитиков и изучения общественного мнения. Максимальная оценка для страны — 10 (практически свободна от коррупции), минимальная — 0 (очень коррумпирована). На первом месте в списке идет Финляндия, получившая максимально возможные 10 баллов; за ней — Дания (9,8) и Новая Зеландия со Швецией (по 9,4).

Беларусь, имеющая 4,1 балла, делит в списке места с 43-го по 47-е с Польшей, Литвой, Сальвадором и Малави. Замыкают список Нигерия (1,2), Югославия (1,3) и Азербайджан с Украиной (по 1,5).

Алексей ЗНАТКЕВИЧ

СЛАВЯНСКИЙ • "СОЮЗ ДВУХ" • "Красная Шапочка и Серый Волк"

(Продолжение. Начало на 1 стр.)

Северо-Западный край и БССР

Переселение и ассимиляция населения присоединенных земель становится стержнем политики России (в дальнейшем СССР), направленной на удержание территорий в составе империи.

Для предотвращения сепаратизма и волнений в Беларуси Москва проводила долгосрочную программу русификации — комплекс мер, направленных на ослабление и постепенную ликвидацию белорусского этноса. Важнейшие из них: запрещение неподвластной Москве белорусской униатской церкви (80% населения Беларуси в начале 19 века были униатами); разрушение европейской системы высшего образования и школ; введение пророссийского школьного образования; запрещение преподавания на белорусском языке и самого употребления названий "Беларусь" и "Литва". Белорусы объявляются исконно русскими, а их католическая часть — поляками; ведется массовое переселение белорусов в Россию (в Сибирь и на Дальний Восток) с использованием экономических механизмов.

В XX веке (в еще большей степени, чем в XIX) Россия и СССР переселяли белорусов добровольно или принудительно. Но не только этим достигалась цель по ослаблению белорусского этноса: при любых геополитических изменениях в западном регионе пересматривались границы. Каждый раз земли, заселенные преимущественно белорусами, передавались соседним странам — Польше, Литве, Латвии. В результате такой политики в уходящем XX веке был остановлен рост белорусского этноса.

По российской переписи 1897 года, на белорусских этнических землях (определяемых по языковой принадлежности) проживало около 10 миллионов белорусов. В начале века по численности они входили в первую десятку европейских народов. За 100 лет численность большинства из них, включая наших соседей — русских, поляков, украинцев — возросла в 1,5-2 раза. Количество же белорусов в XX веке, "благодаря" существованию "суверенной" БССР снизилось до 8 миллионов (80% от зарегистрированного в настоящее время 10-миллионного населения страны).

Еще большие "успехи" достигнуты в XX веке в деле удушения белорусского языка, являющегося, наряду с историей, ключевым элементом этнического самосознания. *Сфера применения белорусского языка за период существования БССР сузилась, благодаря государственной политике русификации образования, более чем в 5-6 раз.* Переписи населения, проводившиеся в Российской Империи в конце XIX века, определяли принадлежность граждан "Северо-Западного края" к белорусам, как правило на основе языка общения. Таких людей в начале века здесь было около 10 миллионов.

В настоящее время осталось только "белорусско-говорящее гетто" — стремительно сокращающееся сельское население (до 20-25 %). Вытеснение белорусского языка — самый большой успех московских "интегрантов"-русификаторов и их белорусских пособников в решении стратегической задачи по ликвидации белорусского этноса с превращением Беларуси в "Северо-Западный край" России.



Фота IREX/ProMedia

Владимир Путин и Александр Лукашенко скрепляют "Союз двух"

В контексте белорусско-российского опыта не исключено, что происходящий на наших глазах крупный геополитический процесс -- объединение Беларуси и России с поэтапным втягиванием нашей страны в состав России — приведет к очередному переделу земель для урегулирования взаимовыгодных интересов России и ее соседей — Польши, Литвы, Украины.

Однако, как свидетельствует опыт 6-летнего правления пророссийского Президента Беларуси, не оставляют без внимания и все другие, выработанные в Российской Империи и СССР, способы русификации белорусов.

Эти программы обсуждались и официально проводились в царской России. В СССР (и БССР) этноцид через русификацию на уровне официальной идеологии отрицался. Подобные заявления относились тогда к категории "антисоветской клеветы". Тем не менее, результаты по ослаблению и ассимиляции белорусского этноса, достигнутые в БССР за 60 лет, многократно превосходят "достижения" царской России. И это вопреки тому, что вышеуказанные цели отрицались. Более того, происходящие в Беларуси процессы назывались не иначе как "высшим этапом развития национальной культуры и дружбы народов" (эта ложь десятилетиями использовалась пропагандистской машиной СССР и до сих пор находится на вооружении белорусского президента для обоснования возврата Беларуси в Союз).

Без сдачи "суверенитета"

В июле 2000 г. А. Лукашенко делает шокирующее своей политической наивностью заявление. "Ликвидация белорусского государства не выгодна России"... И далее: "Они от нас этого не требуют."! Слушая подобные речи, трудно избежать ощущения торга подержанным товаром. Белорусский суверенитет уже выветрился и выцвел под ветрами "Союза двух". Его де-факто как бы уже нет. Расставив на всех ключевых направлениях: политическом, информационном, экономическом и т.д. "надежных" и запустив необратимые механизмы интеграции, "союзник" в состоянии решать в Беларуси любые стратегические задачи и поступать с нашей страной, ее суверенитетом и ее Президентом, исходя из интересов России. Москву устраивает Лубянско-Лукашенковское издание, изобретенного КГБ-КПСС "суверенитета" БССРовского типа. "Суверенная" Беларусь образца 1994-2000 гг., стала преемницей (и уже кое в чем превзошла) БССР в ключевых вопросах: русификации, информационной, политической и экономической зависимости от Кремля. Созданный здесь режим органически не способен, в силу доминирования разрушительных и антибелорусских сил в структурах власти и пророссийской идеологии, реально защитить национальные, экономические и политические интересы белорусского народа. Даже в случаях когда "защитником" выступает Президент (его попытки ограничиваются экономической сферой, в других направлениях он идет в нужном кильватере). Разрушители сильнее и сплоченнее. Свита, делающая "короля", обеспечит необратимость процесса "воссоединения" Беларуси с Россией. Разрушение белорусского государства "внутренними" силами представляется Кремлю, судя не только по вышеуказанному заявлению А.Г., более эффективным средством, чем "требования о сдаче суверенитета". Пока...

Итак, А.Г. обрадовал белорусский народ: сдачи независимости не будет. России это не выгодно. А что будет? Выхолащивание суверенитета до нуля. Путем ослабления белорусского этноса, разрушения белорусской экономики, с постепенным переходом собственности в руки российских воротил (включая криминальных). Российские политики сделали свое дело — подготовили базу (включая юридическую) для экспансии российских олигархов на территорию нашей страны.

Лукашенко наивно полагает, что декларации о равенстве стран, а также его личное вмешательство позволят защитить экономические интересы белорусского народа. Открыты все шлюзы. "Интеграционный" поток начинает разгон по союзному руслу. Одинокий Президент вынужден будет или выбраться из любимого детища, или погибнуть в мутных водах интеграции по-российски.

"Они этого не требуют"

Президент РБ с самого начала своего правления видел идеальное государство для белорусов в БССР. Назад в 1990 год, назад в БССР — лозунги, ставшие одним из идеологических столпов власти.

Чем хороша модель БССР — РБ-Л (Республика Беларусь времен Лукашенко) для московских политиков? Прежде всего тем, что: 1) намертво привязывает Беларусь к России; 2) является отлаженной машиной русификации, ослабления и ликвидации белорусского этноса (эффект Смоленщины).

Для капиталистической России, не обремененной коммунистическими доктринами о социальной справедливости и дружбе между народами, "Союз двух" открывает значительно большие возможности для экспансии на белорусские земли, нежели "дружба" народов в СССР.

